Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ КЛАССЫ: ОПЫТ И ПЕРСПЕКТИВЫ

***Сборник материалов***
***II Республиканской научно-практической конференции***

Минск
БГПУ
2017

Учебно-издательский центр БГПУ
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 377.8
ББК 74.5
П24

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ,
рекомендовано секцией педагогических наук (протокол № 7 от 18.12.17)

Рецензенты:
*А. В. Торхова*, доктор педагогических наук, профессор,
проректор по научной работе учреждения образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»;
*В. Ф. Русецкий*, доктор педагогических наук, доцент,
начальник научно-исследовательского центра
НМУ «Национальный институт образования
Министерства образования Республики Беларусь»;
*И. А. Царик*, кандидат педагогических наук, доцент,
и. о. заведующего кафедрой педагогики
факультета социально-педагогических технологий
учреждения образования «Белорусский государственный
педагогический университет имени Максима Танка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П24 **Педагогические** классы: опыт и перспективы: материалы II Республиканской научно-практической конференции, г. Минск, 3 ноября 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; под ред. А. И. Жука, А. В. Позняк. – Минск : БГПУ, 2017. – 325 с.
ISBN 978-985-541-541-406-4.

В сборнике обобщен опыт работы профильных классов / групп педагогической направленности в Республике Беларусь и определены перспективы педагогической профилизации в учреждениях общего среднего образования.

Адресуется педагогам, специалистам отделов и управлений образования, курирующим организацию профильной педагогической подготовки на III ступени общего среднего образования, всем заинтересованным лицам, педагогическим работникам, занимающимся вопросами непрерывного педагогического образования, профильной и допрофильной педагогической подготовки учащихся.

**УДК 377.8**
**ББК 74.5**

**ISBN 978-985-541-406-4**

© Оформление. БГПУ, 2017

# МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА ЗАНЯТКУ ПА ПРАГРАМЕ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ «ВУЧЫСЯ ВУЧЫЦЦА» У V КЛАСЕ

***В. А. Таўроўская***
*ДУА «Гімназія № 20 г. Мінска»*

**Тэма: Зносіны і ўзаемадзеянне з людзьмі (2 гадзіны)**

**Мэты:**

- азнаямленне з паняццем «зносіны», іх відамі і сродкамі, з асноўнымі спосабамі зносін: мова, міміка, жэсты, асэнсаванне вучнямі ролі зносін у жыцці чалавека;
- фарміраванне навыкаў адэкватных зносін з аднагодкамі і дарослымі, замацаванне навыкаў бесканфліктных зносін, умення слухаць, выказваць сваю думку, аргументаваць і неагрэсіўна адстойваць сваю пазіцыю;
- выпрацоўка абарончых якасцей асобы: упэўненасць у сабе, шчырасць, пачуццё гумару.

Структура занятку: рытуал прывітання; асноўны змест, які накіраваны на развіццё навыкаў зносін; рэфлексія; рытуал развітання.

На працягу занятку выкарыстоўваюцца гульнёвыя метады, элементы трэнінгу, метад групавой дыскусіі, псіхагімнастыка і іншыя.

**Ход занятку:**

*I. Рытуал прывітання.*(Склаўся на папярэдніх занятках*: пляскание адзін раз у далоні і выкід рук з раскрытымі далонямі ўверх).*

*II. Асноўны змест.*

1. Практыкаванне 1. «Давайце пазнаёмімся». Практыкаванне праводзіцца ў крузе. Кожны называе сябе па імені, потым адзін вучань становіцца ў цэнтр круга і па чарзе кідае мяч кожнаму, называючы яго поўнае імя. Практыкаванне паўтараецца некалькі разоў.

   **Вывад:**«Называй субяседніка па імені, і ён будзе так звяртацца да цябе».
2. Слова настаўніка пра зносіны і яго віды.

Зносіны з людзьмі – важная частка нашага жыцця, гэтае ўменне неабходна кожнаму. Што даюць зносіны? Якія бываюць? Як навучыцца зносінам з людзьмі? На гэтыя пытанні мы сёння і паспрабуем знайсці адказы.

Гэтыя навыкі нам патрабуюцца кожны дзень. Аднак «мець зносіны» і «гутарыць» – гэта не адно і тое ж. Зносіны – гэта складаны працэс, які складаецца з двух частак: вербальнай (тое, што мы гаворым) і невербальнай (тое, як мы гэта робім). Як гэтаму навучыцца? Псіхалогія зносін з людзьмі будуецца на некаторых правілах, якія найбольш дакладна сфармуляваў вядомы псіхолаг і пісьменнік Дэйл Карнэгі.

3. Складанне правілаў зносін:

– Якія чалавечыя якасці неабходны для канструктыўных і пазітыўных зносін?

а. Прапанаваны спіс чалавечых якасцей размяркуйце ў два слупкі: пад знак «+» размясціце тыя, якія дапамагаюць у зносінах, і пад знак «-» тыя якасці, якія перашкаджаюць:

дабрыня, шчырасць, падазронасць, уважлівасць, душэўнасць, грубасць, тактоўнасць, зайздрасць, чуласць, сардэчнасць, прагнасць, крывадушнасць, эгаізм,хлуслівасць, прыстойнасць, даверлівасць, сумленнасць.

б. Давайце і мы паспрабуем вывесці правілы зносін.

Вучні працуюць у групах, запісваючы свае правілы зносін. Яны могуць мець наступны выгляд:

1. Будзьце шчырымі.
2. Будзьце справядлівымі.
3.Лічыцеся з чужым меркаваннем.
4. Не бойцеся казаць праўду.
5. Радуйцеся поспехам людзей, якія вакол вас.
6. Будзьце натуральны ў зносінах.
7. Не бойцеся праўды, выказанай пра вас.
8. Не стаўце суразмоўцу ў няёмкае становішча.
9. Імкніцеся да ўзаемаразумення.

4. Вызначэнне ролі зносін. Кожнаму дзіцяці даецца заданне, у якім зашыфравана адна з прыказак:«Меней гавары, болей пачуеш», «Выказанага слова да губы не вернеш», «Слова сказаў – сякераю адсек», «Язык да Кіева давядзе».

Дзецям прапаноўваецца расшыфраваць і прачытаць прыказку «М..н..й г..в..р.., б..л..й п..ч....ш», «Я..ы.. ..а ..іе..а ..а..я....е», «Выказанага слова да губы не вернеш слова сказаў сякераю ад сек язык да кіева давядзе меней гавары болей пачуеш», «Адсек слова сякераю сказаў».

– Чаму так гавораць?
– Як інакш можна мець зносіны, »размаўляць», не выкарыстоўваючы словы?

5. Паведамленне настаўніка пра невербальныя сродкі зносін (міміку, жэсты).

Чалавечыя зносіны на тры чвэрці складаюцца з маўлення, але ўсім добра вядомы сітуацыі, калі «слоў не трэба».

– Што дапамагае нам пры размове?

Так, гэта жэсты, міміка, позірк і інш. Гэта невербальныя сродкі зносін. Яны часта маюць нават большае значэнне, чым словы. Ацэньваючы суразмоўцу, мы не толькі слухаем, пра што ён гаворыць, а звяртаем увагу на яго позу, міміку, рухі. Невербальныя знакі ўніверсальны ва ўсім свеце, таму ўсім зразумелы. Майстры гутаркі часта карыстаюцца метадам, калі паўтараецца поза і жэсты суразмоўніка, бо гэта дапамагае наладзіць даверальныя адносіны. Але гэтаму вучацца, як вучацца навыкам зносін, уменню разумець невербальныя знакі. Для гэтага ёсць пэўныя практыкаванні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. <u>Практыкаванне 2</u>. «Твары». На дошцы піктаграмы «вясёлы твар», «сумны твар», «пануры твар», «здзіўлены твар», «спалоханы твар». Настаўнік прапаноўвае дзецям вызначыць настрой «маскі».

Уводзіцца азначэнне «міміка». Міміка – рух твару, які адлюстроўвае ўнутраны душэўны стан.

На дошцы вывешваецца гэтае азначэнне і запісваецца дзецьмі ў тэрміналагічны слоўнік.

7. <u>Практыкаванне 3</u>. «Маскі». Дзеці разбіваюцца па парах і кожнаму ўдзельніку прапаноўваецца: а) выразіць пры дапамозе мімікі гора, боль, страх, радасць. Другі ўдзельнік павінен вызначыць, што перадае твар партнёра. Затым дзеці мяняюцца ролямі. б) выкарыстоўваючы «сумную маску», сказаць вясёлую фразу і наадварот.

*Вывад*: выраз твару адыгрывае важную ролю ў зносінах. Эмоцыі «чуваць» лепш, чым мову. Здольнасць зразумець эмацыянальны стан чалавека і магчымасць перадаць свае эмоцыі пры дапамозе мімічных сродкаў – найбольш высокая ступень чалавечых зносін.

8. <u>Практыкаванне 4.</u> «Піктаграма».

– А ці ведаем і разумеем мы адзін аднаго?

За 2–3 мінуты кожнаму вучню трэба зашыфраваць сябе праз сімвалы і значкі, якія б адлюстроўвалі яго жыццёвыя захапленні, лад жыцця ці найбольш ярка праяўленыя рысы характару. Затым ананімныя малюнкі замацоўваюцца на дошку, вучні вызначаюць, каму магла б належаць тая ці іншая піктаграма і чаму.

9. <u>Практыкаванне 5</u>. «Жэсты». Звяртацца адзін да аднаго можна і без слоў, а з дапамогай жэстаў.

– Я прапаноўваю вам успомніць, якія жэсты вы ведаеце, і паказаць іх класу.
– Як з дапамогай вядомых вам жэстаў можна перадаць просьбу, радасць, адмаўленне, пытанне, сум, жах?

10. <u>Практыкаванне 6</u>. «Іншаземец». Вы трапілі ў другую краіну, вас не разумеюць, бо вы не ведаеце мовы. Паспрабуйце спытаць з дапамогай жэстаў: «Колькі часу?», «Дзе ў вас знаходзіцца чыгуначны вакзал?», «Як прайсці да гасцініцы, да мора...».

*Вывад*: пантаміміка – вельмі інфармацыйны спосаб зносін.

11. Слова настаўніка пра ролю слова ў зносінах. Пра тое, як словам можна пакрыўдзіць, а можна і зрабіць чалавеку прыемнае.
12. <u>Практыкаванне 7</u>. «Гэтыя розныя словы». Дзецям прапаноўваецца ўспомніць і назваць ласкавыя, ветлівыя словы.
13. Камунікатыўны трэнінг. Магчымыя сітуацыі:
    1. Дыялог вучня і вучаніцы на ўроку: вучань зламаў ручку. Ён пытаецца пра запасную ручку ў суседкі.
    2. Дыялог маці і сына дома: мама бачыць, што сын, не падрыхтаваўшы ўрокі, захапіўся камп'ютарнымі гульнямі.
    3. Дыялог вучня і вучаніцы (аднакласнікаў) на дыскатэцы: вучань адзначае, як прыгожа апранута дзяўчына.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Складанне памяткі «Уважлівы слухач».

Аднак мы не толькі гаворым, а і слухаем. Калі вы жадаеце спадабацца людзям, то выконвайце правіла: будзьце ўважлівым слухачом.

– Як развіць уменне ўважліва слухаць?

Пасля адказаў, прапанаваных вучнямі, можна скласці памятку.

1. Пачынайце слухаць адразу ж. Прапусціць пачатак гутаркі ўсё роўна, што прапусціць пачатак фільма.
2. Уважліва выслухвайце суразмоўцу:
   - дайце суразмоўцу час выказацца, не перабівайце яго;
   - спыніце ўсе справы, якія адцягваюць вашу ўвагу: не спрабуйце слухаць і аднначасова рабіць яшчэ дзве – тры справы;
   - не рабіце выгляд, што вы слухаеце: калі вам па нейкіх прычынах цяжка ці немагчыма слухаць, так сумленна і скажыце.
3. Абавязкова падтрымлівайце з суразмоўцам кантакт:
   - задавайце пытанні, удакладняйце адказы;
   - ківайце галавой, глядзіце ў вочы;
   - усміхайцеся (суперажывайце).

*III. Рэфлексія.*

1. Прагляд м/ф «Крошка Янот».

Пытанні для гутаркі:

– Чаму Крошка Янот баяўся «Таго, хто жыве ў вадзе?»

– Што дапамагло Яноту пасябраваць з «Тым, хто жыве ў вадзе?»

2. Заданне: «З дапамогай жэстаў зрабіць суседу па парце падарунак ці камплімент».

*IV. Рытуал развітання.* (Нахіліць галаву *і прыцiснуць дзве рукі да сэрца).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ
Учебно-издательский БГПУ